




# Вялікая любоў да малой Радзімы

**У мэтах захавання і прымнажэння нацыянальнага духоўнага і культурнага набытку, гістарычнай спадчыны і прыроднага багацця краіны, самабытных традыцый беларускага народа, выхавання моладзі ў духе любві да Бацькаўшчыны 2009 год абвешчаны ў Беларусі Годам роднай зямлі.**

У сувязі з гэтым нельга не адзначыць важную для педагагічнай грамадскасці падзею, што адбылася 10 лютага 2009 г.: Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці на базе Беняконскай сярэдняй школы прымаў удзельнікаў абласнога семінара кіраўнікоў і педагогаў устаноў адукацыі, якія завяршаюць рэалізацыю рэспубліканскага інавацыйнага праекта «Укараненне аўтарскай мадэлі выхавання ў працэсе краязнаўчай дзейнасці». Кансультант інавацыйнага праекта – начальнік упраўлення выхаваўчай і ідэалагічнай работы Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Наталля Канстанцінаўна Катовіч. Кансультант-каардынатар праекта – метадыст аддзела адукацыйных сістэм і тэхналогій Гродзенскага інстытута развіцця адукацыі Людміла Анатольеўна Кіўлюк.

Семінар быў арганізаваны з мэтай падвя-



Гасцей у Беняконскай школе сустракаюць хлебам-соллю



Кіраўнікі семінара (справа налева): Н.К. Катовіч, Л.А. Кіўлюк, Т.П. Дудко

дзення вынікаў інавацыйнай дзейнасці. Сярод задач, якія ставілі арганізатары:

стварэнне ўмоў для фарміравання інавацыйнай культуры і станаўлення суб'ектнай пазіцыі педагагічных кадраў – удзельнікаў інавацыйных працэсаў у галіне выхавання, укаранення ў масавую практыку пазітыўных вынікаў інавацыйнай дзейнасці па тэме праекта;

распрацоўка метадычных рэкамендацый да планавання мерапрыемстваў Года роднай зямлі.



Метадычная выстава

Ва ўтульным свежаадрамантаваным будынку Беняконскай сярэдняй школы (дырэктар – Тадэуш Рамуальдавіч Тупко) сустрэліся прадстаўнікі інавацыйных пляцовак: Азярніцкай СШ Слонімскага раёна, Лойкаўскай і Воранаўскай СШ Гродзенскага раёна, СШ № 1 г. Дзятлава, а таксама педагогі іншых школ і пазашкольных устаноў г. Гродна і вобласці.

У ходзе семінара ўсе прадстаўнікі інавацыйных пляцовак падзяліліся вопытам сваіх калектываў і асаблівасцямі работы па ўкараненні аўтарскай мадэлі выхавання ў працэсе краязнаўчай дзейнасці. Вельмі важна тое, што, нягледзячы на агульную тэму, кожны праект арыгінальны. Сутнасць выкарыстання інавацый у педагагічнай практыцы – не ў сляпым капіраванні, а ў прытрымліванні асноўнай ідэі, рэалізацыі вядучых прынцыпаў праз усю разнастайнасць і своеасаблівасць навучальна-выхаваўчага працэсу кожнай школы.

Кіраўнікі і педагогі расказвалі аб поспехах, дасягненнях вучняў, перамогах у шматлікіх конкурсах, алімпіядах і канферэнцыях. Што асабліва каштоўна, у выступленнях былі агучаны не толькі станоўчыя аспекты інавацыйнай дзейнасці. Удзельнікі семінара адкрыта падзяліліся

тымі цяжкасцямі і праблемамі, якія ўзнікалі ў іх. Толькі такі падыход дае імпульс да пошуку эфектыўных шляхоў выхаваўчай работы, дазваляе тым, хто ідзе следам, пазбегнуць памылак папярэднікаў.

Сапраўдны прыклад супрацоўніцтва і адзінства ўсіх суб'ектаў педагагічнага працэсу – гэта запрашэнне на семінар вучняў, прычым не толькі Беняконскай школы, але і іншых навучальных устаноў Гродзеншчыны. Старшакласнікі актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні вынікаў праекта, дзяліліся ўласнымі поглядамі на ролю краязнаўчай работы ў выхаванні любві да роднай зямлі, выказвалі свой погляд на прадстаўленыя ў выступленнях разнастайныя формы і метады краязнаўчай работы ў школах,задавалі хвалюючыя іх пытанні настаўнікам і кіраўнікам.



**Вучні абмяркоўваюць пытанні семінара**

Трэба адзначыць высокі навукова-метадычны ўзровень выступленняў, глыбіню аналізу і абагульненняў атрыманых на практыцы вынікаў. Інфармацыйна-тэхнічнае суправаджэнне выступленняў дазволіла присутным у поўнай меры скласці ўяўленне аб сутнасці і спецыфіцы работы кожнай пляцоўкі: камп'ютэрныя прэзентацыі, схемы і дыяграмы, відэафрагменты і інш. наглядна ілюстравалі ход інавацыйнай дзейнасці.



**Удзельнікі семінара – педагогі школ Гродзеншчыны**

Арганізатары семінара здолелі стварыць асабістую, вельмі цёплую, адкрытую, святочную атмасферу. Нягледзячы на кароткія тэрміны, гаспадары семінара – супрацоўнікі аддзела адукацыі Воранаўскага раённага выканаўчага камітэта і калектыў Беняконскай сярэдняй школы – рэалізавалі вельмі насычаную праграму: далі слова ўсім прадстаўнікам інавацыйных пляцовак, арганізавалі работу навукова-метадычнай лабараторыі па ацэнцы эфектыўнасці прадстаўленага вопыту, паказалі некаторыя формы краязнаўчай дзейнасці, створаныя ў ходзе праекта, сярод якіх – экскурсіі «Сцяжынкамі Міцкевіча» і «Культурная спадчына нашага краю».

***А.В. Пазняк***